# СА СВЯТАМ КАСТРЫЧНІКА!

*А ЛЕНІН УСЁ БУДУЕ*
*НОВЫ СВЕТ*
*РУКАМІ ТЫХ, ХТО*
*У ЛЕНІНА ПАВЕРЫУ.*

*ЖЫЦЦЁ ВІТАЕ*
*НОВЫХ ДЗЕН ЗАРУ,*
*РАСЦЕ АЙЧЫНА*
*НАША — ГОРДАСЦЬ*
*ЭРЫ.*

**Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце вялікім рэвалюцыйным вучэннем—марксізмам-ленінізмам, вышынямі навукі, тэхнікі і культуры! Будзьце ў першых радах барацьбітоў за паспяховае выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (863) ● ПЯТНІЦА, 3 лістапада 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

*З ВУЧОНАГА САВЕТА*

## ПОСПЕХ СТВАРАЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНА

Восень юбілейнага года паклала свой адбітак на ўсе бакі універсітэцкага жыцця. Важныя задачы, пастаўленыя перад вышэйшай школай, успрыняты ў калектыве універсітэта як праграма неадкладнага дзеяння.

Вучоны савет БДУ, які адбыўся на мінулым тыдні, дэталёва абмеркаваў план мерапрыемстваў па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне». Выступаючы з дакладам, рэктар, прафесар У. М. Сікорскі падкрэсліў асаблівасці прынятай пастановы, узнятыя ў ёй важныя праблемы і канкрэтныя задачы, якія неабходна здзейсніць кожнай вну, каб узняць падрыхтоўку спецыялістаў і развіццё навукі на ўзровень сучасных патрабаванняў.

Прапанаваны для абмеркавання план мерапрыемстваў ахоплівае ўсе важнейшыя бакі дзейнасці: арганізацыйную работу, удасканаленне навучальнага працэсу, развіццё навуковых даследаванняў, павышэнне ўзроўню ідэйна-палітычнага выхавання і культурна-масавай работы, пытанні падрыхтоўкі, падбору, расстаноўкі кадраў і павышэнне іх кваліфікацыі, развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы.

З карыснымі прапановамі, дапаўненнямі, меркаваннямі выступілі дэкан юрыдычнага факультэта І. С. Цішкевіч, начальнік ВЦ А. А. Пальцаў, загадчык кафедры матэматычнага аналізу Ф. Д. Гахаў, прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько, дацэнт кафедры педагогікі М. У. Піскуноў, загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету Ф. М. Нячай.

Зацверджаны на савеце дакладны план прадугледжвае вялікі аб'ём працы. Ён патрабуе высокай адказнасці і сапраўднага энтузіязму ў рабоце кожнага члена універсітэцкага калектыву.

В. АРЛОЎ.

## IV УСЕСАЮЗНЫ ЗАВЕРШАН

**25—27 кастрычніка ў Маскве праходзіла Усесаюзная студэнцкая канферэнцыя па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР.**

**Канферэнцыя падвяла вынікі IV Усесаюзнага конкурсу, праходзіўшага ў 1971—1972 гг. Як і на папярэднім, III Усесаюзным конкурсе, зноў вялікага поспеху дабіліся студэнты нашага універсітэта. На заключны, трэці этап цяперашняга конкурсу, рэспубліканскае журы рэкамендавала 32 работы з БДУ.**

**Пераможцамі IV Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху сталі 14 студэнтаў нашага універсітэта. Яны былі запрошаны ў Маскву і прынялі ўдзел у заключнай канферэнцыі.**

**Лаўрэатамі конкурсу сталі: Р. СЯРВУТА, В. ГАРГОЦ, І. ШЫРШОЎ, Ю. ШАБАЛЬ (гістфак). Ім уручаны значкі, медалі і дыпломы МВ і ССА СССР і ЦК ВЛКСМ.**

**Граматамі і дыпломамі ўзнагароджаны таксама Г. ЖУК (біяфак), М. САЎКО, Г. ІЛЬЯШЧУК, У. ДУК, А. ШЫШКЕВІЧ, А. ЖДАНОЎСКІ, С. МАЛАЖАНАВА, А. ЗЛОТНІКАЎ, Г. ГРУШАВОЙ, Г. ПРАЦКО (гістфак).**

**Горача віншуем лаўрэатаў і дыпламантаў конкурсу, а таксама іх навуковых кіраўнікоў прафесараў Ус. М. СІКОРСКАГА, М. Я. ШКЛЯРА, А. Я. ЖУРАВА, В. І. СЦЯПАНАВА, дацэнтаў І. А. РАБКОВА, С. Я. ЯНЧАНКУ, П. П. СІЛІВАНЧЫКА, І. О. ЦАРУК, А. У. ЦАРУКА, А. А. МІХАЙЛАВА, М. І. ІОСЬКУ, А. А. БІРАЛУ з вялікай перамогай!**

**Д. САКОВІЧ,**
**намеснік старшыні савета па навукова-даследчай рабоце студэнтаў.**



*Выдатнік. Ленінскі стыпендыят. Ужо другі год аднадушна выбіраюць яго сакратаром камітэта камсамола факультэта. Любіць спорт і добрую кнігу. Як хапае на ўсё часу? Дапамагаюць цвёрдая воля, жаданне авалодаць сваёй прафесіяй, шчырыя адносіны да людзей.*

*Знаёмцеся: Міхаіл НІКІШЫН, студэнт факультэта журналістыкі.*

*Фота В. ЖУКА.*

## СВЯТОЧНЫЯ ПАДАРУНКІ

Іх зрабілі дысертанты...

Калі ва універсітэце бачыш людзей з кветкамі, можна не сумнявацца — сёння абарона.

З пачатку гэтага навучальнага года неаднойчы ўрачыста віталі члены вучоных саветаў БДУ папаўненне атрада вучоных.

Аднак асабліва, мабыць, радасна атрымаць віншаванні напярэдадні вялікага свята. У кастрычніку такія віншаванні прымаў загадчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва юрфака А. А. Галаўко, абараніўшы доктарскую дысертацыю, а ў гэтыя дні — Д. Д. Флетчар і І. Г. Ляонаў, якія трымалі экзамен на ступень кандыдата навук.

А. КУЗНЯЦОЎ.

## НАВІНЫ ПРАФСАЮЗНАГА ЖЫЦЦЯ

**● Адбылося пасяджэнне прэзідыума прафкома БДУ. Абмеркаван ход падрыхтоўкі да Кастрычніцкіх свят. Прынята рашэнне аб'явіць конкурс на лепшае афармленне калоны. Пераможцы атрымаюць прызы.**

**На гэтым жа пасяджэнні вырашана пытанне аб выдзяленні транспарту лепшай групе кожнага факультэта для паездкі ў Хатынь і на Курган Славы.**

**● На працягу гэтага года звыш 600 студэнтаў нашага універсітэта адпачылі і папраўілі здароўе у міжвузаўскім санаторыі-прафілакторыі, што знаходзіцца ля Заслаўскага вадасховішча. Нядаўна адбыўся чарговы заезд. Звыш 70 студэнтаў атрымаюць тут неабходную лячэбную дапамогу.**

**● Народны ансамбль танца «Крыжачок» прыступіў да рэпетыцый малдаўскіх танцаў, якія паставіў спецыяльна запрошаны ва універсітэт заслужаны артыст Малдаўскай ССР В. А. Рыжыкаў.**

**● Гасцінна сустрэлі сяброў з Сафіі ў калектыве нашага універсітэта. Балгарскія студэнты наведаюць лабараторыі і кафедры, выступяць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці перад студэнтамі і на прадпрыемствах горада, наведаюць славутыя мясціны Мінска.**

**І. СЦЯПУРА,**
**(Карпункт прафкома БДУ).**

## СТУДЭНЦКІ ЎКЛАД

Студэнты геаграфічнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце кафедры геадэзіі і картаграфіі. У 1971-72 годзе кафедра выконвала вялікую і адказную работу па складанню дзяржаўнай карты насельніцтва СССР па матэрыялах усесаюзнага перапісу насельніцтва СССР 1970 г. Да выканання гэтай работы былі прыцягнуты студэнты V і III курсаў.

Вельмі працаёмкую і складаную работу па складанню адрасных карт і карт люднасці населеных пунктаў Віцебскай і Гродзенскай абласцей правялі студэнткі V курса Катовіч і Стральчэня. Гэтыя карты з'явіліся асновай іх дыпломных работ, паспяхова абароненых сёлета.

У складанні карты насельніцтва БССР, якая была перададзена ў Гіпрасельбуд для работ па раённай планіроўцы, актыўны ўдзел прынялі студэнты III курса Антановіч, Бабіцкая, Лукша, Шумаева, Лобан, Куляшова, Уласава, Альхоўская, Галкіна, Пташнік, Мохарава. Студэнтка Байко вядзе работу па распрацоўцы методыкі складання карты тапалогіі населеных пунктаў (на прыкладзе Браслаўскага раёна). Такая карта будзе складзена супрацоўнікамі кафедры ў 1973 годзе.

**В. КРЫШЧАНОВІЧ,**
**загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі.**



*З ГІСТОРЫІ КАМСАМОЛА*

## ВАЖАК МОЛАДЗІ

Ішоў 1919 год. У Маскве фарміраваўся атрад камсамольцаў-добраахвотнікаў для адпраўкі на Петраградскі фронт. «У райком з'явіўся віхрасты юнак і рашуча запатрабаваў адправіць яго на фронт. Атрымаўшы адмову, ён не асабліва пратэставаў, толькі мацней насунуў скамечаную кепку і загадкава ўсміхнуўся. А праз некалькі дзён юнака знайшлі пад лаўкай у вагоне эшалона маскоўскіх добраахвотнікаў, якія адпраўляліся ў Піцер біць белагвардзейскія банды Юдзеніча. Ішоў у тую пару хлапчуку шаснаццаты год. Гэта быў Аляксандр Косараў».

У гэтым невялікім эпізодзе, расказаным А. Мільчаковым, бадай, увесь Аляксандр Васільевіч Косараў — рашучы ў дасягненні мэты, страсны барацьбіт за справу партыі.

Саша Косараў, сын маскоўскага рабочага, пачаў працаваць з 11 год. У 1918 г. ён уступіў у Сацыялістычны саюз рабочай моладзі, пасля—у камсамол, а ў шаснаццаць год — у партыю бальшавікоў. У полымі грамадзянскай вайны мужнеў і гартаваўся характар Аляксандра.

У 20-я гады А. В. Косараў знаходзіўся на кіруючай камсамольскай рабоце ў Ленінградзе, Пензе і Маскве.

К моманту выбрання яго ў сакавіку 1929 г. генеральным сакратаром ЦК ВЛКСМ моладзь краіны ўжо добра ведала імя таленавітага камсамольскага важака. На гэтым пасту найбольш поўна раскрыліся яго арганізатарскія здольнасці.

У 1933 г. А. В. Косарава як выпрабаванага кіраўніка Ленінскага камсамола, выдатнага арганізатара камсамольскіх мас у іх барацьбе, пад кіраўніцтвам партыі, за перамогу пяцігодкі ўзнагародзілі ордэнам Леніна.



Інжынер С. П. Федарышчаў працуе на кафедры радыяцыйнай хіміі ўжо трэці год. Два гады з іх прысвечаны распрацоўцы метадаў радыяцыйнага хімічнага сінтэзу амінакіслот. Атрыманыя вынікі ўжо дазваляюць меркаваць, што амінакіслоты можна будзе атрымліваць з недарагой сыравіны.

Вялікую дапамогу ў рабоце аказваюць новыя, сучасныя прыборы. У прыватнасці, поўнасцю аўтаматызаваны амінакіслотны аналізатар — адзін з навейшых прыбораў, прымяняемых у хіміі,—скарачае час аналізу больш чым у 10 разоў. Вынікі, атрыманыя з яго дапамогай, характарызуюцца вельмі высокай дакладнасцю.

Фота Д. Чаховіча.

# З РАЗЛІКАМ НА БУДУЧАЕ

Калектыў нашай кафедры здзяйсняе навучальны працэс па курсу агульнай фізікі (механіка, малекулярная фізіка, электрычнасць і оптыка) на першых двух курсах факультэта. У саставе кафедры—лабараторыі фізічнага практыкума па ўсіх раздзелах курса агульнай фізікі, лабараторыі дэманстрацыйнага эксперыменту і методыкі выкладання фізікі, навукова-даследчая лабараторыя па спектраскапіі і люмінесцэнцыі. У сацыялістычных абавязацельствах, прынятых да 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР, адлюстраваны ўсе асноўныя напрамкі дзейнасці калектыву.

У першую чаргу мы звяртаем увагу на удасканаленне навучальнага працэсу, пастаноўку і мадэрнізацыю з прымяненнем сучаснага абсталявання лабараторных работ, на выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання.

Так, цяпер у лабараторыі механікі і малекулярнай фізікі заканчваецца распрацоўка эксперыментальнай машыны для аўтаматычнага апытвання студэнтаў перад выкананнем імі лабараторнай работы. Вопыт, накоплены гэтай лабараторыяй, дазволіць у далейшым распаўсюдзіць гэты метад і на іншыя лабараторыі фізпрактыкума.

Другі важны бок паляпшэння навучальнага працэсу — удасканаленне лекцый. Гэта праяўляецца не толькі ў якасці падрыхтоўкі выкладчыка да лекцыі, але і ў распрацоўцы і ўдасканаленні праграм па курсах агульнай фізікі. Гэты працэс цяпер завяршаецца на факультэце.

Асаблівае значэнне пры чытанні лекцыі мае ўжыванне тэхнічных сродкаў навучання, якія змогуць наглядна прадэманстраваць студэнту тую ці іншую фізічную з'яву. Кафедра мае ў сваім распараджэнні асноўныя дэманстрацыйныя матэрыялы па ўсіх раздзелах агульнай фізікі, аднак гэтага недастаткова. У цяперашні час лабараторыя дэманстрацыйнага эксперыменту пачала вялікую работу па забеспячэнню кожнага курса агульнай фізікі комплексам тэхнічных сродкаў, які будзе ўключаць непасрэдную дэманстрацыю з'явы, паказ дыяпазітываў і кінафільмаў, якія тлумачаць фізіку данай з'явы. Гэта работа непарыўна звязана з тэхнічным забеспячэннем лекцыйных аўдыторый, іх агучваннем, стварэннем аўтаматычнага кіравання паказам дыяпазітываў і кінафільмаў. У перспектыве прадугледжваецца ўвядзенне аўтаномнай сістэмы тэлебачання на дзве паточныя аўдыторыі.

У навукова-метадычным плане распрацоўваюцца метады ацэнкі ўменняў і навыкаў студэнтаў пры вывучэнні курса агульнай фізікі. Па некаторых курсах маюцца ўжо адзіныя планы правядзення лекцыйных і практычных заняткаў са студэнтамі дзённай і вячэрняй форм навучання, вывучаюцца магчымасці ўдасканалення вучэбных планаў з мэтай больш правільных суадносін паміж колькасцю вучэбных гадзін на лекцыйныя, практычныя і лабараторныя заняткі, вядзецца перапрацоўка курсаў лекцый з улікам патрабаванняў сучасных перспектыўных метадаў навучання.

Кафедра прыступіла да падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па методыцы выкладання фізікі ў вышэйшай школе.

У навукова-даследчай лабараторыі кафедры супрацоўнікі сумесна з выкладчыкамі вывучаюць люмінесцэнтныя ўласцівасці розных арганічных рэчываў пры ўздзеянні на іх звычайнымі і магутнымі (лазернымі) крыніцамі святу.

За час існавання кафедры абаронена адна кандыдацкая дысертацыя, рыхтуюцца да абароны доктарская і тры кандыдацкія дысертацыі.

Усе члены нашага калектыву поўныя рашучасці і далей удасканальваць навучальны працэс, развіваць даследаванні па навуковай і навукова-метадычнай рабоце з тым, каб унесці і свой уклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў-фізікаў.

А. САРЖЭЎСКІ,
загадчык кафедры агульнай фізікі, дацэнт.

*ДЗЕЛІЦЦА ДУМКАМІ КУРАТАР*

# ПА АДКАЗНАСЦІ І ПРАВЫ

Аб рабоце куратараў гавораць многа. І не дзіўна. Кола іх клопатаў практычна бязмежнае. А часам яго яшчэ штучна пашыраюць: ускладаюць функцыі, не ўласцівыя куратару. Але гэта іншая размова.

У гэтай жа заметцы мне хочацца падзяліцца сваімі думкамі аб рабоце куратараў на малодшых курсах. Тут яна асабліва важная і адказная. На першы курс прыходзяць людзі і з сярэдняй школы, і пасля службы ў радах Савецкай Арміі, і пасля некалькіх год работы на вытворчасці — людзі, розныя па ўзросту, інтарэсах, поглядах на жыццё і вучобу, па густах і настроях. Вось у гэты час ад куратара і патрабуецца максімальная ўвага, пастаянная прысутнасць, не фармальны інтарэс да ўсяго ў жыцці групы. Бо прадстаіць сур'ёзная справа — фарміраванне калектыву, зацікаўленага, патрабавальнага, добразычлівага. Калі ўдасца стварыць такі калектыў, добра пойдзе вучоба, грамадская работа, цікавым і паўнацэнным стане жыццё групы.

На аснове шматгадовага вопыту складваецца перакананне, што ўсё гэта магчыма толькі пры сапраўднай актыўнасці і кантраліруемай самастойнасці саміх студэнтаў. Ні ў якім выпадку куратар не павінен падмяняць камсамольскі і прафсаюзны актыў групы, старасту. Кожны член калектыву павінен у поўнай меры несці адказнасць за тую справу, якая яму даручана.

Роля куратара ў такім калектыве— роля старэйшага таварыша, дарадчыка, памочніка, чалавека, да якога можна прыйсці з усімі бедамі, радасцямі, праблемамі і сумненнямі. Гэта далёка не проста, як не простая ўсякая работа з людзьмі. Тут няма і не можа быць гатовых рэкамендацый, прыгодных ва ўсіх выпадках. Тут павінна быць педагагічная, чалавечая інтуіцыя, глыбокая зацікаўленасць у кожным чалавеку. І самае галоўнае — у нашай рабоце няма месца абыякавасці.

Другая важная задача куратара — навучыць студэнтаў правільна працаваць. Бо не сакрэт, што ў сярэдняй школе да апошняга часу бытуе сістэма навучання, якая не прывучае лагічна мысліць, аналізаваць матэрыял.

У вну рэзка ўзрастае аб'ём падрыхтоўкі, і далёка не ўсе студэнты могуць лёгка прызвычаіцца да новага стылю работы. У гэтым ім неабходна дапамагчы. Трэба расказаць, як слухаць лекцыю і весці канспект, дапамагчы арганізаваць самастойную работу, пракантраляваць размеркаванне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, азнаёміцца з умовамі жыцця студэнтаў.

Куратару неабходна падтрымліваць пастаянны кантакт з выкладчыкамі, якія чытаюць лекцыйныя курсы і вядуць семінары і практыкумы. Толькі ў гэтым выпадку можна своечасова прыйсці на дапамогу, даць карысную параду. На наш погляд, небескарысна правесці са студэнтамі І курса хранаметраж рабочага тыдня. Гэта дапаможа ім больш рацыянальна спланаваць падрыхтоўку па розных прадметах.

Але, вяртаючыся да сказанага, хочацца падкрэсліць, што ва ўсіх гэтых справах самы непасрэдны ўдзел павінны прыняць актывісты ўсёй групы, а не толькі куратары.

Некалькі слоў мне хочацца сказаць аб наспеўшай неабходнасці дакладна вызначыць не толькі абавязкі, але і правы куратараў. Бо агульнавядома, што часта на куратараў перакладваюць абавязкі адміністрацыі, грамадскіх студэнцкіх арганізацый. Аднак яшчэ горш абстаяць справы з куратарскімі правамі. Ад нас, куратараў, натуральна, патрабуюць глыбокага ведання студэнтаў, іх характару, умоў іх жыцця і г. д. Але не заўсёды лічацца з меркаваннямі куратараў. Не стаў яшчэ практыкай абавязковы ўдзел куратараў у такіх важных мерапрыемствах, як размеркаванне месц у інтэрнатах і стыпендый, абмеркаванне любых пытанняў, звязаных з групай. Такое становішча не садзейнічае павышэнню аўтарытэту і ролі куратараў, не садзейнічае паляпшэнню работы ў акадэмічных групах.

Е. ШАЛАПЁНАК,
дацэнт біяфака.



Метад праграміраванага навучання ўжываецца на кафедры аналітычнай хіміі ўжо другі год. І, на думку выкладчыкаў, гэты метад апраўдаў сябе як для папярэдняга апытання, так і ў паглыбленым вывучэнні якаснага аналізу.

НА ЗДЫМКУ: выкладчык І. Ф. ЗІМІНА і студэнт ІІ курса С. АЛЬФЕР ля машыны «Ласточка».

Фота Д. Чаховіча.

# НЯЛЁГКАЕ ПАЗНАННЕ

**ЗАМАЛЁЎКІ З ПРАКТЫКІ**

Хутка бяжыць час. Першыя залікі, першыя экзамены, шмат усякіх клопатаў. І, нарэшце, самае галоўнае — летняя журналісцкая практыка.

— Ну, вось і прыбыло папаўненне, — уздыхнуў рэдактар любанскай раёнкі. — Работы ў нас зараз—хоць адбаўляй. Часу на раскачку няма. Ляці зараз жа на крухмальны завод, напішаш аб камсамольскім жыцці. Не хапае матэрыялу на другую старонку нумара.

У грудзях чамусьці зашчымела: ці спраўлюся? Але трымаюся бадзёра. Распытваць, што ды як, не дазволіў «прафесійны гонар».

Што рабіць? Я ж ніколі не пісаў аб жыцці камсамольскай арганізацыі прадпрыемства. Галоўнае, не бянтэжыцца, смялей адчуваць, падбадзёрваў сябе па дарозе. Не такая ўжо складаная тэма, ёсць нарэшце, сякі-такі план. Буду яго трымацца.

— Вам што? — незадаволена і, як здалося, з нейкай злосцю спытаў сакратар камсамольскай арганізацыі, якога знайшлі на заводзе па маёй просьбе.

І раптам... думкі мае замітусіліся, зблыталася ў галаве раней складзеная схема размовы. Усё пачалося не так, як хацелася.

— Чаго ж вы маўчыце?— настырна наступаў на мяне віхрасты хлопец. — Я ж ад станка прама, часу няма.

Апамятаўшыся крыху, пачаў задаваць пытанні, мабыць, без мэты і сэнсу, адно за адным, баючыся, пэўна, каб гэты чалавек не пайшоў ад мяне зусім. Але ж мне здалося, што твар юнака стаў неяк выцягвацца, і ён часцей замаргаў вачыма. Я, нарэшце, спыніўся.

— А хто ж ты такі?— запытаўся ён зноў, нецярпліва аглядаючы маю постаць знізу ўверх.

Пяцярня мая сама сабой пацягнулася да патыліцы, каб прыгладзіць сваю адрослую грыву. І толькі тут успомніў, што я нават не прадставіўся чалавеку.

— Так бы і сказаў, — крыху супакоіўся сакратар, даведаўшыся, хто я такі і адкуль з'явіўся.

Давялося пачынаць размову спачатку.

Цэлы вечар і нават ноччу пісаў я свой «твор». А раніцой у рэдакцыі ганарліва паклаў яго на завалены паперамі сакратарскі стол. Усяго некалькі позіркаў на лісток спатрэбілася сакратару, каб паўгадзіны працягвалася цяжкая, непрыемная для мяне гутарка.

— Усё гэта, браце, не тое,—бурчэў ён, не падымаючы галавы.—Ёсць, вядома, тут факты і прозвішчы, але няма паміж імі ніякай сувязі. Аб тым, каб паставіць у нумар, няма чаго і гаварыць.

Перарабіць! Сказана гэта—як адрэзана. Але як выканаць, калі ранейшага запалу, упэўненасці як і не было. Праўда, ад сакратаровай парады нешта засталося. І ўсё ж...

Цэлыя дзве гадзіны бадзяўся па гораду, каб пасвятлела ў галаве, затым вярнуўся ў рэдакцыю, сеў за чыйсьці незаняты стол і пачаў... грызці аловак. Праз гадзіну ад яго засталася толькі палавіна. Але ж я пісаў! Пісаў, крэсліў, крэсліў і зноў пісаў. Цягнулася гэтак да самага вечара. Нарэшце пастаўлена апошняя тлустая кропка. Здаецца, усё атрымалася добра, і я паімчаў да машыністкі.

— Колькі ж можна перадрукоўваць, — накінулася на мяне жанчына. — Вунь у мяне колькі работы! Сёння нічога не выйдзе, і не прасі.

Улашчваў, упрошваў — не дапамагло. Прыйшлося бегчы за цукеркамі. Памякчэла крыху. Але, не надрукаваўшы і палавіны, нявесела пакруціла галавой:

— Мабыць, і гэта не пойдзе?

Так, не пойдзе. Перакanaўся і я сам, закрэсліўшы палову напісанага. Астатнюю частку, вядома, не пашкадуе рэдактар. Хіба што атрымаецца інфармацыя. А я ж замахваўся на замалёўку. Браўца зноў за пяро, здаецца, не было ніякага сэнсу. Але тут адбылася размова з рэдактарам.

— Схадзіў бы ты, стары, на гэты завод яшчэ раз. Паглядзі, як працуе моладзь, пагутары з юнакамі, дзяўчатамі, удакладні факты, знойдуцца новыя.

І вось тут я раптам уцяміў. Сам сабе мусіў прызнацца, што быў, як гаворыцца ў той прымаўцы, у Маскве, ды бачыў усяго залатыя макаўкі. Ні з кім з камсамольцаў не гутарыў. Чым жыве прадпрыемства, не ведаю. Абмежаваўся размовай з сакратаром, палічыў, што і гэтага хопіць.

І зноў знаёмая прахадная, у кішэні пропуск у цэхі. Пабач з важаком камсамольцаў крочым ад станка да станка. Маладыя рабочыя ахвотна дзеляцца думкамі, расказваюць аб сабе, аб сваіх справах, поспехах, няўдачах.

— А вечарам пабывайце ў нас на сходзе, — запрасілі мяне на развітанне. — Будзем падводзіць вынікі.

Я, зразумела, прыйшоў.

Вось яна — залатая жыла! Лёгка кладуцца на паперу радок за радком, знаходзяцца параўнанні, эпітэты, усе журналісцкія атрыбуты. Атрымліваецца баявы рэпартаж.

Не дзень, а тыдзень прайшоў, пакуль з'явілася ў раёнцы не вельмі вялікая заметка. Але затое прыемна было пачуць на «лятучцы»: «...напісана практыкантам нядрэнна». І яшчэ зразумеў адно: каб сказаць людзям вернае слова—трэба глыбей ведаць жыццё.

В. ХАРЫТОНАЎ,
студэнт другога курса.

# Да 90-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа



## ЛЮБІМЫ НАСТАЎНІК

Якуб Колас пільна сачыў за стварэннем першага ў гісторыі Беларусі універсітэта, радаваўся яго першым поспехам і дасягненням. Са свайго боку універсітэцкае студэнцтва і навуковая грамадскасць праяўлялі вялікую цікавасць да творчасці і асобы песняра.

Калі ў канцы 1922 года ў Беларусі шырока адзначалася саракагоддзе з дня нараджэння Якуба Коласа, ва універсітэце адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае юбілею паэта. На вечары прысутнічаў сам юбіляр. Ён горача падзякаваў студэнтам і выкладчыкам за цёплыя словы і высокую ацэнку яго творчасці.

З таго ўрачыстага пасяджэння, мабыць, і пачынаецца цеснае супрацоўніцтва Я. Коласа з універсітэтам. Спачатку яно вылілася ў працу на настаўніцкіх курсах, якая па-сапраўднаму захапіла паэта. Сведчанне гэтаму — тагачасныя лісты да жонкі і артыкул «Слуцкія курсы», змешчаны ў газеце «Савецкая Беларусь» у 1923 годзе. Па ўспамінах сучаснікаў, лекцыі на курсах чыталіся надзвычай таленавіта і дасціпна. Здаралася, што на занятках Якуб Колас чытаў настаўнікам свае новыя вершы. А дэкламатарам ён быў цудоўным.

Аднойчы пасля чытання асобных частак паэмы «Новая зямля» адзін слухач, які суперэчліва ставіўся да беларускасці, заначыў: «Я не ведаў, што па-беларуску можна так пісаць. Зарэжце мяне. калі я не навучуся беларускай мове».

У 1923 годзе Я. Колас канчаткова вырашае перайсці на педагагічную працу ва універсітэт. 28 верасня ён падае заяву ў прадметную камісію БДУ на імя Замоціна. У лістападзе 1923 г. просьба Я. Коласа была задаволена. Ён стаў выкладчыкам універсітэта. Вось што ўспамінае Міхаіл Іванавіч Жыркевіч, адзін з тагачасных студэнтаў Я. Коласа, цяпер заслужаны дзеяч навукі БССР: «Студэнты ў аўдыторыі чакалі выкладчыка мовы К. М. Міцкевіча. Не ўсе ведалі, што гэта будзе Я. Колас. Сустрэлі мы яго з вялікай радасцю. Перад намі быў выдатны майстар слова, вядомы беларускі пісьменнік. Заняткі па роднай мове, методыка правядзення іх адразу захапілі нас. Ён вёў іх так, што мы адчулі мастацкасць, прыгажосць і сілу роднага слова. Мову беларускую мы вывучалі з вялікай ахвотаю, заўсёды старанна рыхтаваліся да заняткаў. Часта студэнты звярталіся да Канстанціна Міхайлавіча з просьбай прачытаць свае новыя творы. Наш любімы настаўнік задавальняў просьбу. Чытаў ён выразна, з натхненнем. Гэта быў узор таго, як трэба карыстацца мастацкім словам, даносіць яго да слухача. Я. Колас ухваляў і заохвочваў імкненне нашых маладых пісьменнікаў да вучобы. Дарэчы, Я. Колас дапамог паступіць ва універсітэт маладнякоўцу Паўлюку Трусу, якога лічыў самабытным і даравітым хлопцам. Частым госцем і сваім чалавекам быў Колас у інтэрнацкіх пакоях студэнтаў. Па-бацькоўску распытваў ён пра матэрыяльнае становішча, зусім не чураючыся пазычыць дзесятку-другую, кажучы з усмешкай: «Аддасцё, калі заробіце».

У час працы ва універсітэце Я. Колас натхнёна працуе і на літаратурнай ніве. Новыя творы песняра былі заўважаны крытыкай. Аднак большасць ацэнак, выказаных у той час Коласу, была адмоўнай.

Менавіта вучоныя універсітэта далі аб'ектыўную ацэнку паэту, сцвердзіўшы правільнасць абранага ім шляху. І. Замоцін, прафесар універсітэта, першы з крытыкаў высока і справядліва ацаніў «Новую зямлю». У другой палове 30-х гадоў яго падтрымаў М. Р. Ларчанка, цяпер прафесар універсітэта.

У гэты ж час Я. Колас стварае першую ў беларускім мовазнаўстве методыку выкладання роднай мовы. Аўтар «Методыкі роднай мовы» выказваецца за рэформу беларускага правапісу.

3 снежня 1924 года загадам Народнага камісарыята асветы БССР Я. Колас зацвярджаецца дацэнтам педфака БДУ.

Але ў 1926 годзе Я. Колас падае ў дэканат педфака БДУ заяву наступнага зместу: «З прычыны майго нездароўя змушан прасіць дэканат зволіць мяне ад выкладання беларускай мовы на педагагічным факультэце БДУ».

Такім чынам, Я. Колас працаваў ва універсітэце з лістапада 1923 года па 17 студзеня 1926 г. Аднак сувязі класіка беларускай літаратуры з БДУ не парываліся і пазней. Я. Колас прысутнічаў на вечарах, сустракаўся са студэнтамі і выкладчыкамі. А ў сувязі з 20-годдзем літаратурнай дзейнасці Я. Коласа і прысваеннем яму звання народнага паэта па ініцыятыве рэктарата універсітэта, дэканата педфака у Мінскім Доме асветы быў арганізаван урачысты вечар.

У 1927 годзе, як прыгадвае пісьменнік А. Пальчэўскі, універсітэцкі драмгурток паставіў п'есу Я. Коласа «Забастоўшчыкі». На прэм'еры прысутнічаў аўтар. Ён сказаў: «Я яшчэ раз перажыў той момант, калі пісаў п'есу», — і моцна паціснуў руку ўсім удзельнікам спектакля.

У 1929 годзе калектывам педфака БДУ Якуб Колас быў вылучан дэпутатам Мінскага гарадскога Савета.

Дружба Якуба Коласа з нашым універсітэтам не парывалася і пазней, у 30-я гады, у віхурныя гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час.

**Л. АЎГУСЦІНОВІЧ,**
**студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

*Пазаўчора на філалагічным факультэце адбылася юбілейная студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. На ёй было прачытана 8 дакладаў. Аб дакастрычніцкай лірыцы Я. Купалы расказала студэнтка Ж. Бляхер. Два даклады— Н. Дзмітрычэнкі і Л. Кавалеўскай — былі прысвечаны перакладчыцкаму майстэрству паэта. Аб творчасці Я. Коласа расказалі студэнты Н. Бахно, Л. Дземідовіч і Л. Качалка. Не менш цікавымі былі паведамленні Т. Чабан і Л. Аўгусціновіч аб сувязях вялікіх песняроў Беларусі з нашым універсітэтам.*

## ЮБІЛЕЙНАЕ ВЫДАННЕ

Яны прараслі з карэнняў прапахлай сялянскай нядолі, багата акропленай потам зямлі. Яны, як ніхто, адчулі імкненні народа свайго і аддалі яму палымяны жар сэрцаў. Мы абавязаны ім вельмі многім. Гэтае ўсведамленне свайго бясконцага абавязку перад народнымі песнярамі, гонар за іх спараджае мноства кніг, манаграфій, навуковых даследаванняў іх творчасці.

Нядаўна на паліцах кнігарняў з'явіўся зборнік артыкулаў выкладчыкаў нашага факультэта пад назвай «Народныя песняры». Гэтае выданне прысвячаецца 90-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

Кніга адкрываецца артыкулам прафесара М. Р. Ларчанкі «Горкаўскія традыцыі ў рэалізме Я. Купалы і Я. Коласа». Аўтар гаворыць пра своеасаблівасць рэалізму Купалы і Коласа, але галоўную ўвагу скіроўвае на блізкасць і роднаснасць эстэтычных поглядаў Горкага, Купалы і Коласа.

Прафесар І. Я. Навуменка сканцэнтроўвае ўвагу на своеасаблівасці паэзіі Купалы. А яна ў тым, што, «малюючы саламяную вёску, яе побыт, яе жыхара — селяніна, ён думаў адначасна пра ўвесь народ, пра чалавека наогул, пра сэнс яго жыцця». Аўтар зазначае рэвалюцыйны характар гуманізму паэта, адзначае паліфанічнасць купалаўскай паэзіі.

«Каля вытокаў...» Так называе свой артыкул прафесар А. А. Лойка. Са своеасаблівым вытокам сівога Нёмана аўтар параўноўвае «жывое крынічанне-выплыванне двух струменяў» — Купалы і Коласа. А. А. Лойка адзначае драматычную напружанасць дарэвалюцыйнай купалавай лірыкі і ў той жа час «журботна-элегічны» лірызм Коласа. Аўтар супастаўляе паэмы «Курган» і «Новая зямля», вызначае выдатнейшыя рысы гэтых фундаментальных твораў.

«У багатай і шматграннай творчай спадчыне Купалы вялікае месца займаюць мастацкія пераклады...»,—так пачынае гаворку пра купалаўскую школу перакладу дацэнт С. Х. Александровіч. Аўтар скрупулёзна аналізуе той вялікі ўклад, які ўнёс Я. Купала ў практыку мастацкага перакладу.

У заўвагах аб паэтычнай мове твораў Я. Купалы дацэнт Н. С. Гілевіч выказвае вельмі слушную думку: «Варта было б больш гаварыць пра паэтычную мову Купалы як пра мову народа, выразнікам дум і настрояў якога паэт з'яўляўся». Аўтар разглядае купалаўскія словы-наватворы, указвае на іх сувязь з народнымі гаворкамі. Н. С. Гілевіч паказвае, што Купала ўладар не толькі беларускай песні, а і роднага слова.

Зборнік артыкулаў «Народныя песняры» змяшчае, апрача названага, працы выкладчыкаў нашага факультэта В. В. Казловай, Л. І. Фіглоўскай, У. А. Навумовіча, Я. І. Семяжона, К. Р. Хромчанкі, В. П. Краснея, М. Б. Яфімавай, Д. Я. Бугаёва, В. П. Рагойшы.

Аўтары зборніка ўносяць новы ўклад у коласазнаўства і купалазнаўства.

**Т. КУПРЭВІЧ,**
студэнтка І курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

## У «РОДНЫМ КУЦЕ» ПЕСНЯРА

Вялізнае разложыстае дрэва ўсё абсыпана было празрыста-белай квеценню. Рой пчол манатонна гудзеў у блакітнай вышыні, кружыў над чаромхай-нявестай. І вакол—цішыня.

Зусім побач паважны Нёман спакойна паблісквае паміж зазелянеўшых лугоў. Жаўрукі вызвоньваюць у бяздоннай сіняве сваю адвечную песню. Майскае сонца прыемна лашчыць твар, вецер даносіць пах свежаўзаранай зямлі і аддалены рокат трактара.

Тут пісалася «Новая зямля», «Сымон-музыка», дапрацоўвалася трылогія «На ростанях». Адсюль пачыналі мы сваё падарожжа па коласаўскіх мясцінах.

Мікалаеўшчына — вёска вялікая, шумная, сучасная. Але домік Міцкевічаў неяк воддаль, як бы на хутары, амаль на самым беразе Нёмана. Таму тут такая ціша, спакой...

Музей, цагляны будынак, — цэлая скарбніца звестак пра роднага песняра. Жывая памяць — дзядзька Юзік. Даволі жвавы, цікаўны чалавек, ён так проста расказваў пра сваё дзяцінства, пра брата Косціка. Праводзячы па музеі з залы ў залу, знаёміў з новымі і новымі, большай часткай невядомымі нам дэталямі жыцця і творчасці паэта. І ў дадатак да свайго расказу пастаянна цытаваў вершы, урыўкі з «Сымона-музыкі». А з «Новай зямлі» так артыстычна прачытаў «А гэты Юзік — шаляніца»... і цэлы раздзел «Дарэктар», што мы ўсе літаральна былі зачараваны дэкламацыяй.

Побач з музеем — хата, дзе жылі Луцэвічы, дзе адбылася сустрэча Я. Коласа з Я. Купалам.

Мы забавіліся ў Мікалаеўшчыне амаль да вечара. Вырашылі на беразе Нёмана гатаваць вячэру. Варылі бульбу на кастры, спявалі песні, слухалі салаўёў.

Назаўтра з самай раніцы адправіліся ў Альбуць — «родны кут» Якуба Коласа. Былая леснічоўка, простая сялянская хата, выглядала з-за белай чаромхі і магутных дубоў. Тут усё знаёма і звычна: і ручэй, і мосцік. Праз яго—і «гумно, пакрытае саломай», і бусеянка на ім, і старажытныя дубы — усё, як у «Новай зямлі».

Тут было сапраўднае «камарынае царства». Ад камар'я адбіваліся, бараніліся дымам кастра. Адпачыўшы і падмацаваўшыся, мы пайшлі лесам, наўпрост у Акінчыцы. У вёсцы захавалася хатка, дзе Якуб Колас нарадзіўся, аб чым сведчыла мемарыяльная дошка.

З Акінчыц да Стоўбцаў прыйшлося ісці пешшу, бо дзень быў святочны, і перапоўненыя аўтобусы не спыняліся, імчаліся міма. Але ў вагоне, забыўшыся на стомленасць, зноў спявалі песні, запісвалі ў дзённікі свае ўражанні.

**Г. АГАЛАКАВА,**
**член гуртка гісторыі і тэорыі роднай літаратуры.**

## ГАРЭЎ КАСЦЁР НА ЎЗЛЕСКУ

Спорт

**Гэта даўно стала традыцыяй. Праходзіць лета, заканчваюцца паходы, вяртаюцца дамоў падарожнікі. У клубе турыстаў-альпіністаў БДУ становіцца цесна і шумна. І ў адзін з кастрычніцкіх выхадных адвозіць электрычка ў Вязынку ці ў Крыжоўку гаманлівую кампанію з гітарай і рукзакамі, якія яшчэ захоўваюць пах кастроў, што гарэлі ля Алібекскай хаціны, пад Чатынам, на зялёных схілах Карпат...**

**На гэты раз члены секцыі альпінізму і ўсе тыя, хто аднойчы і назаўсёды пасябраваў з дарогамі, правялі свой XIV злёт непадалёку ад Радашковіч. Дрэннае надвор'е крыху змяніла праграму, але на настроі ўдзельнікаў не адбілася.**

**Пад поліэтыленавым тэнтам размясціліся плакаты, малюнкі. Тут можна было пазнаёміцца з усёй гісторыяй клуба: цэлая гірлянда пажаўцелых газетных выразак, сабраных амаль за 10-годдзе, расказвала аб паходах, аб мінулых злётах. Каўказ, Алтай, Урал, Карпаты, Кольскі паўвостраў — дзе толькі не раскладвалі свае кастры турысты універсітэта!**

**Палатачны гарадок адразу зрабіў утульным мокры ўзлесак. Вечарам касцёр сабраў усіх яго жыхароў на беразе ручая. Загучала гітара. Амаль да ранку блукалі ў ельніку абрыўкі песень, шматкі сіняватага дыму.**

**А вось група з ліхтарамі і компасамі: у 12 гадзін ночы стартавалі арыенціроўшчыкі. Маршрут быў кароткі, каля 2 км, але яго ўскладняла і надвор'е — дождж упарта працягваў імжаць, — і гушчар—арганізатары маршруту пастараліся, каб на шляху ўдзельнікаў хапала перашкод. Да таго ж, на пікетах не было кастроў, якія звычайна так дапамагаюць у начным арыентаванні. Нямногія з удзельнікаў уклаліся ў кантрольны час і прайшлі праз усе пікеты. Але ўсіх іх — задаволеных, хоць і мокрых, — чакаў на фінішы касцёр, і гэта было прыемна.**

**Раніцай усіх паклікала паласа перашкод. Вось дзе могуць навічкі навучыцца альпінісцкаму і турысцкаму майстэрству, а заадно і выпрабаваць сябе. Як заўсёды, вясяліла ўсіх традыцыйная пераправа.**

**Два дні вясёлага гумару, песень, успамінаў аб паходных прыгодах. Магчымасць адчуць побач столькі сяброў, падзяліцца тым багаццем думак, пачуццяў, што прывёз кожны з паходу, загарэцца новымі марамі — гэта, мусіць, самае каштоўнае, што даюць такія злёты.**

**Т. ЗАСІМ.**

# Літаратурная старонка

ШТОМЕСЯЧНЫ ВЫПУСК

Валерый ДРАНЧУК

## РОДНАЕ

Мне светла
ад блакіту неба,
Мне светла
ад маланак і дажджоў,
Ад чорнага
ржанога хлеба
Мне—
светла.

Мікола ЦЯЛЕГА

## СІНЯВЫ АДВЯЧОРАК

Сінявы адвячорак,
Наспелая зара,
Няспынным неспакоем
Гуллівая пара.
Найлепш — шчаслівы пошум
Сівых—дасветла — ліп.
На схіле дня мы зможам
Адчуць зямны прыліў.
І бачацца — прысады:
Расці, расці, расці!..
Па-свойму кожны рады
Святочнаму ў жыцці.
А над зямлёю — зораў
Багатая пара.
Забыты адвячорак,
Даспелая зара.

* * *

Кветка шчасця не зацьменнем
Абляцела на далонь.
Залатое — у карэнні —
Завязалася вузлом.
А пялёстак — хай у памяць,
Хто каханне убярог.
Перасмяглымі губамі —
Сем вятроў з сямі дарог.



ВОСЕНЬ ЗАЛАТАЯ. Фотаэцюд В. Жука.

Паліна ХАРЭВІЧ

## ВІШНІ

Вішні—пякуча-чырвоныя ноты—
Гараць на промнях-лінейках,
Звоняць пра сонца,
як пчолы над сотамі,
І — абпальваюць вейкі.

Раптам — згаслі...
Спяваць не хочуць,
Маўчаць,
як трэці лішні.
Вечар зажмурыў
анюціны вочы,
Сніць, пэўна,
спелыя вішні.

Анатоль ШУШКО

## І ТЫ ІДЗІ

І ты ідзі, пакуль відаць сляды
Твайго маленства
свежыя,
як лісце,
Дзе успамінам — кропелька
вады,
Што —
важкая —
з галінкаю
адвісне.

І ты чакаеш: зваліцца ці не?
Баішся, нібы міг таго палёту,
Што разаб'ецца на імшыстым дне
Сівога бору, агарне сумотай,
І ты,
адзіны,
на зыходзе дня
Адчуеш прагна,
як далёка недзе
Брыдзе праз час
святая цішыня,
Каб хтось
шчаслівы быў у гэтым свеце.

* * *

Зіма. І сена на драбінах.
След пакідаюць палазы.
Палае горача рабіна,
Каб не злавалі маразы.

І водар прэлага аеру,
Як паўзабыты лета пах,
Зноў будзіць згубленую веру
І светлы дзень ў маіх вачах.

Зіма... Стамлёны бацькаў
кашаль...
Натруджана ўздыхае конь:
Мы, як парваную супонь,
Каханне нашае ці звяжам?..

Люба ТАРАСЮК

## ВЫТОКІ



Адкуль нашых сэрцаў вытокі,
Якія нам рады сосны?..
Пад небам адным высокім
Безліч нябёсаў розных.

Шукаем заўжды асновы
І верым сваім Палессям.
Там, дзе канчаецца слова,
Пачынаецца песня...

Не высахнуць вытокам,
Што поўны жыцця бясконца.
Ды толькі
ці кожны — глыбокі,
Ці кожны — святло і сонца?..

## КАБ СПЯВАЛІ ДАРОГІ

Мне б у хату тваю — парогам,
Каб штодзень ты прыходзіць мог,
Каб спявалі твае дарогі
Пад вятрамі маіх трывог.

Каб свяцілі твае бярозы
У зялёных маіх гаях,
Дзе журылася песня позна
Непадгледжаная мая.

Да нявызначанай сустрэчы,
Як да колішняе мяжы...
Як пражыць гэты дзень, гэты вечар...
Падкажы, любы, мне, падкажы!..

* * *

Жанчыны ў полі песні жалі,
Збіралі словы у снапы,
То звонкай радасцю, то жалем
Спявалі ў іх руках сярпы.

І над прыціхлым светла полем
Адна мелодыя расла.
Жанчын такая, пэўна, доля —
Вырошчваць зерні хараства.

А сонца здзіўлена прыстала.
Чэз песень жніўных сум ў трысці...
Я з гэтых песень вырастаю
І не магу без іх расці...



РОДНЫ МІНСК. Фота Л. Калюжнай.

Мікола ПЯТЛІЦКІ

## МАЁ ПАЛЕССЕ

Пайду ў лугі або па сінім лесе
Прайду туманнай раніцай
грыбной...
І зоў, і зноў азёрнае Палессе
Ва ўсёй красе ляжыць перада
мной.
Там крочыць борам восень
залатая,
Па версах ідзе на паплавы.
Там і цяпер у вырай адлятаюць
З чыйгось маленства птахі
жураўы.
Баёў агністых светлыя харомы
На узбярэжжы соннае ракі,
І ўсё часцей, і ўсё хутчэй дадому
Мяне прыводзяць думы-цягнікі.

І кожны раз сыходжу ў ціхім лесе
Не з чамаданам, з кошыкам
грыбным,
Каб зноў абняць цябе, маё
Палессе,
Маленькім сэрцам радасным
сваім.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Заказ. 1290.
АТ 02417